УДК 94 (476) «1921/1939»

# КАТАЛІЦКІ КАРПАРАЦЫЙНЫ РУХ І ХРЫСЦІЯНСКІЯ КАРПАРАЦЫІ ВІЛЕНСКАГА ЎНІВЕРСІТЭТА Ў МІЖВАЕННЫ ПЕРЫЯД

**Крывуць Віталій Іванавіч**
Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт (г. Баранавічы, Беларусь)

*Даклад прысвечаны аналізу каталіцкай плыні ў студэнцкім карпарацыйным руху на тэрыторыі міжваеннай польскай дзяржавы, у склад якой уваходзіла і Заходняя Беларусь. Характарызуюцца яго ідэалогія і адносіны з іншымі каталіцкімі арганізацыямі. Таксама паказана развіццё дзейнасці каталіцкіх карпарацый на тэрыторыі Віленскага ўніверсітэта імя С. Баторыя.*

У міжваенны перыяд Віленскі ўніверсітэт з'яўляўся арэнай дзейнасці шматлікіх студэнцкіх саюзаў. Так, у 1937/38 навучальным годзе тут існавалі 73 такія арганізацыі [1, с. 174–177]. Да іх адносіліся і студэнцкія карпарацыі. Сучасныя польскія даследчыкі называюць карпарацыі своеасаблівым "кангламератам навуковага гуртка, ідэйнай арганізацыі, таварыскага клуба і самаадукацыйнай групы" [2, с. 103]. Фактычна гэта былі элітарныя аб'яднанні, якія мелі характар закрытых мужчынскіх таварыскіх клубаў (колькасць членаў адной карпарацыі не павінна была перавышаць 100 чалавек). Пачатак студэнцкіх карпарацый узводзяць да "нацый" сярэдневяковых французскіх і італьянскіх універсітэтаў, членамі якіх былі студэнты з адной краіны ці правінцыі. З XVI ст. падобныя зямляцтвы існавалі ў нямецкіх універсітэтах. Менавіта на аснове іх і сфарміраваліся студэнцкія карпарацыі сучаснага тыпу [3, с. 178–179]. Першыя карпарацыі ці буршэншафты ўзніклі ў 1815 г. у Енскім універсітэце. Тады ўпершыню былі распрацаваныя адметныя знакі і ўнутраная іерархія гэтых арганізацый [3, с. 190].

Да першай паловы XIX ст. адносіцца і пачатак польскага карпарацыйнага руху. Лічыцца, што яго традыцыі заклалі філаматы і філарэты, тайныя таварыствы віленскіх студэнтаў 1817–1823 гг. Пасля іх разгрому частка віленскіх студэнтаў выехала ў Дэрпт (Тарту). Там яны стварылі Польскі саюз, які ў маі 1828 г. быў ператвораны ў карпарацыю "Палонія". Яна прыняла формы нямецкіх буршэншафтаў, спалучыўшы іх з польскімі патрыятычнымі ідэаламі. У 1919 г., пасля адраджэння польскай дзяржавы, "Палонія", у адпаведнасці з завяшчаннем сваіх заснавальнікаў, перанесла сваю рэзідэнцыю ў Вільню [4, с. 8].

Міжваенныя гады сталі перыядам росквіту студэнцкіх карпарацый, у тым ліку і ў Віленскім універсітэце імя С. Баторыя (УСБ). Усяго ў Вільні ў 1919 – 1939 гг. існавала, верагодна, да 25 карпарацый. Найбольш уплывовымі з іх з'яўляліся "Палонія", "Баторыя", "Палесія", "Крэсовія", "Леаніданія", "Канкордзія Вільненсіс" і "Філаматыя Вільненсіс" [5]. Яны з'яўляліся членамі агульнапольскага Саюза польскіх акадэмічных карпарацый (СПАК) і былі цесна звязаныя с польскім нацыяналістычным рухам, які ва ўніверсітэцкім асяроддзі быў прадстаўлены арганізацыяй "Усепольская моладзь".



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Але ў карпарацыйным руху юнавалі і іншыя плыні, акрамя нацыяналютычнай. Так, у 1924 г. у выніку канфлікту ўнутры карпарацый паміж прыхільнікамі каталіцкай студэнцкай арганізацыі "Адраджэнне" і "Усепольскай моладзі" адбыўся раскол у СПАК. З яго выйшлі некалькі карпарацый, якія ўтварылі асобнае Аб'яднанне польскіх акадэмічных хрысціянскіх карпарацый (АПАХК) [4, с. 19].

Асаблівую ўвагу ў АПАХК звярталі на больш моцнае выкарыстанне ў жыцці студэнцкіх карпарацый каталіцкай рэлігіі. У сувязі з гэтым, карпарацыі, якія ўваходзілі ў дадзенае аб'яднанне, выступалі супраць вырашэння канфліктаў паміж студэнтамі праз паядынкі і катэгарычна забаранялі сваім членам удзельнічаць у дуэлях (дуэлі традыцыйна з'яўляліся часткай карпарацыйнага жыцця яшчэ з ХіХ ст.) [6, с. 118].

У ідэйнай дэкларацыі АПАХК (1924 г.) было заяўлена, што ідэйная і выхаваўчая праца ў карпарацыях павінна праводзіцца ў духу хрысціянскай этыкі. Мэтай карпарацыі абвяшчалася "карысць Нацыі", яна павінна была працаваць над фарміраваннем "адважных, ахвярных і сумленных грамадзян Польскай рэспублікі". Рэальная праца хрысціянскай карпарацыя разумелася як праца, якая праводзіцца ва ўсіх даступных сферах польскага жыцця, асабліва ў сацыяльнай сферы, у тым ліку сярод рабочай і рамесніцкай моладзі. Сацыяльная акцыя павінна была абапірацца прынцыпах справядлівасці і хрысціянскай любві і імкнуцца "да вяртання працы належнай годнасці і грамадскага значэння". Таксама падкрэслівалася, што хрысціянскія карпарацыі з'яўляюцца беспартыйнымі і займаюцца рэлігійнымі, палітычнымі і навуковымі пытаннямі [6, с. 120].

Фактычна, ідэалогія АПАХК пераклікалася з ідэйнымі пастулатамі арганізацыі "Адраджэння", якая была часткай Каталіцкай акцыі і кіравалася ў сваёй дзейнасці папскімі "сацыяльнымі" энцыклікамі. Гэта вяло да таго, што на тэрыторыі ўніверсітэтаў хрысціянскія карпарацыі цесна супрацоўнічалі з "Адраджэннем". Афіцыйныя крыніцы нават прызнавалі, што карпарацыі з АПАХК знаходзяцца пад уплывам "Адраджэння" [7, с. 26]. Хрысціянскія юнавалі ў Познані, Варшаве, Львове, Любліне, Кракаве і Вільні. На з'ездзе АПАХК у 1931 г. прысутнічалі дэлегаты ад 17 карпарацый [6, с. 124]. Гэта было значна меньш, чым колькасць карпарацый, членаў нацыяналютычнага СПАК.

Калі казаць пра УСБ, то тут юнавалі 2 хрысціянскія карпарацы: "Снядэцыя" і "Конрадзія". "Снядэцыя" была створана ў 1926 г. студэнтамі медыцынскага факультэту. Яе дэвізам было: "Праўда, Дабро і прыгажосць; Усё для карысці чалавецтва". Карпарацыя "Конрадзія" таксама ўзнікла ў 1926 г. Яе лозунгам былі словы: "Кахаю ўсю нацыю, жадаю падняць яе, ашчаслівіць" [6, с. 491 – 492].

Што тычыцца ідэалогіі, то, напрыклад, у ідэйнай дэкларацыі "Конрадзіі" было заяўлена, што свой светапогляд карпарацыя грунтуе на хрысціянскай веры і філасофіі, якія з'яўляюцца "невычэрпнай крыніцай творчай чалавечай думкі". Таксама сцвярджалася, каталіцкая этыка гэта крыніца гонару [6, с. 190].

Як і іншых універсітэтах, віленскія хрысціянскія карпарацыі цесна супрацоўнічалі з "Адраджэннем". Так, у маі 1927 г. "Конрадзія" разам з "Адраджэннем" і некаторымі іншымі каталіцкімі арганізацыямі стварылі Акадэмічны антыдуэльны камітэт, мэтай якога было правядзенне акцыі супраць паядынкаў у студэнцкім асяроддзі [8, с. 5]. Таксама хрысціянскія карпарацыі ўваходзілі ў склад Пагаднення акадэмічных каталіцкіх арганізацый. Пагадненне было створана ў 1931 г. для арганізацыі супрацоўніцтва ў сферы студэнцкага рэлігійнага жыцця [6, с. 190].



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Аднак неабходна прызнаць, што карпарацыі "Снядэцыя" і "Конрадзія" не мелі значнага ўплыву сярод віленскага студэнцтва. Значна большым быў уплыў нацыяналютычных карпарацый, а сярод каталіцкіх саюзаў лідарам быў віленскі філіял "Адраджэння", частка членаў якога ў 1930-х гг. перайшла на даволі радыкальныя пазіцыі.

## Літаратура


1. Skład Uniwersytetu w roku akademickim 1938/39 // Rocznik Uniwersytetu Stefana Batorego w Wilnie 1938–1939. – Wilno: Nakładem USB, 1939. – S. 123–180.

2. Laszczkowski, M. Piłsudla – poiska korporacja akademicka w Wilnie / M. Laszczkowski. – Niepodległość. – 2008. – T. LVIII. – S. 103–130.

3. Ćwietilk J. Korporacje niemieckie / J. Ćwietlik, Z. Krzemiński // Rocznik Korporacyjny 1828–1928. – Warszawa: Drukarnia Techniczna, 1928. – S. 178–194.

4. Muszyński, W. II Rzeczpospolita korporancka / W. Muszyński, J. Persa // Giaukopis. – 2003. – № 1. – S. 7–60.

5. Wróblewski,B.Wieńskieśrodowiskokorporacyjnewiatach1918–1939/B.Wróblewski//Arcblwum Korporacyjne [Электронны рэсурс]. – 2010. – Рэжым доступу: http://www.arcblwumkorporacyjne.pi /index.php/muzeum-korporacyjne/wiino/htmi. – Дата доступу: 31.01.2022.

6. Tomaszewski, P. Poiskie korporacje akademickie w iatach 1918–1939 / P. Tomaszewski. – Toruń: CYCERO.PL, 2011. – 516 s.

7. Atlas organizaczj społecznych / pod red. A. Skwarczyńskiego. – Warszawa: Wydawnictwo Towarzystwa kultury i oświaty, 1932. – 38 s.

8. Akcja przeciwpojedynkowa // Dziennik Wileński. – 1927. – 3 maja. – S. 5.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова